тельная активность, любознательность, самостоятельность и инициативность в решении поставленных задач. Изучаемый материал успешно используется детьми в повседневной жизни.

Данная форма работы при детско-взрослом взаимодействии, как совместно с педагогическими работниками, так и семейные проекты, развивает более доверительные отношения при работе с семьёй, повышает профессиональную и родительскую компетентность и даёт возможность не только узнать интересы и потенциал детей, но и развить их.

**Заключение.** Лэпбук можно использовать не только при обобщении изученного, но и при изучении нового материала. Основные преимущества использования лэпбука в специально организованной и нерегламентированных видах деятельности: структурирует большой объём данных; побуждает интерес у детей к познавательному развитию; может разнообразить занятие или совместную деятельность со взрослыми; развивает креативность и творческое мышление; простой способ запоминания; объединяет детей для увлекательного и полезного занятия.

Таким образом, информация, представленная в лэпбуке, выполняет познавательную и развивающую функцию. Работая с лэпбуком, у ребёнка раскрывается его индивидуальность, реализуются интересы и потребности, что, в свою очередь, способствует личностному развитию.

**Список цитируемых источников**

1. Учебная программа дошкольного образования / М-во образования Респ. Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2019. — С. 479.

2. *Мартынова, Н. Т.* Лэпбук как вид совместной деятельности взрослого и детей [Электронный ресурс] / Н. Г. Мартынова. — Режим доступа: https://infourok.ru/proekt-lepbuk-prednaznachen-dlya-sovmestnoy-deyateln . — Дата доступа: 20.04.2020.

УДК 373.24

**Маруцік Ірына Станіславаўна**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Гарадзішчанскі яслі-сад", Гарадзішча, Рэспубліка Беларусь, gorodistche-sad@Baranavichy.edu.by*

## АРГАНІЗАЦЫЯ КАМУНІКАТЫЎНАГА БЕЛАРУСКАМОЎНАГА АСЯРОДДЗЯ ПРАЗ ГУЛЬНЯВУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

У артыкуле раскрываюцца асноўныя падыходы стварэння гульнявога камунікатыўнага асяроддзя, якое з'яўляецца адным з эфектыўных сродкаў увядзення беларускамоўнай лексікі ў гутарковую мову дзяцей.

**Ключавыя словы:** гульнявое асяроддзе; гульні; маўленне дзяцей.

**Marutik Irina Stanislavovna**

*Gorodishche Nursery-kindergarden, Gorodistche, Baranavichy district, Belarus, gorodistche-sad@Baranavichy.edu.by*

## ORGANIZATION OF A COMMUNICATIVE BELARUSIAN-SPEAKING ENVIRONMENT THROUGH GAMING ACTIVITIES

The article reveals the main approaches to creating a playful communicative environment, which is one of the most effective means of introducing Belarusian-language vocabulary into the spoken language of children.

**Key words:** game environment; games; children's speaking.

**Уводзіны.** У адпаведнасці з адноўленым зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, навучанне і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту арганізуецца ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізма і накіравана на засваенне выхаванцамі дзвюх дзяржаўных моў (рускай і беларускай). У сувязі з гэтым актуальным застаецца пытанне стварэння камунікатыўнага асяроддзя для выхаванцаў з мэтай фарміравання навыка зносін на беларускай мове.

**Асноўная частка.** Аўтар шматлікіх вучэбных дапаможнікаў па развіцці маўлення і навучанні грамаце Наталля Сцяпанаўна Старжынская прапануе ажыццяўляць навучанне дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове ў двух накірунках: 1) паступовае апусканне ў адпаведнае камунікатыўнае асяроддзе з мэтай неўсвядомленага засваення беларускай мовы ў паўсядзённых зносінах; 2) навучанне спосабам пабудовы выказванняў на беларускай мове ў працэсе спецыяльна арганізаванай дзейнасці. Авалоданне

© Маруцік І. С., 2021



Репозиторий БарГУ

разам з рускай мовай беларускай складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення ім нацыянальнай культуры, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці [1, с. 3].

Каб дзіця пачало размаўляць па-беларуску, неабходна ствараць ва ўстанове дашкольнай адукацыі паўнавартаснае беларускамоўнае асяроддзе. Гэта датычыцца не толькі спецыяльна арганізаванай, але і нерэгламентаванай дзейнасці, арганізацыі сюжэтна-ролевых гульняў, а таксама правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў, фальклорных святаў, арганізацыі даследчай работы з выхаванцамі.

Педагогі дашкольнай установы заўсёды ў пошуку новых форм і сродкаў далучэння выхаванцаў да беларускай мовы, беларускіх традыцый і культуры, для гэтага ствараецца прадметна-прасторавае асяроддзе, якое садзейнічае развіццю пазнавальнай актыўнасці і маўлення дзяцей, іх сацыялізацыі, адказвае цікавасці і патрабаванням выхаванцаў.

Улічваючы, што дашкольны ўзрост — спрыяльны перыяд у жыцці дзіцяці, калі фарміруецца цікавасць і патрэба да зносін, на развіццё маўлення асабліва ўплываюць гульні як асноўны від дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту [2, с. 81]. У практыцы выкарыстоўваюцца розныя гульні: дыдактычныя, народныя, музычна-карагодныя, гульні-драматызацыі, творчыя гульні.

Асабліва значная для дашкольніка сюжэтна-ролевая гульня, якая спрые фарміраванню ў выхаванцаў ініцыятыўнасці, самастойнасці, здольнасці выбіраць сабе род заняткаў і ўдзельнікаў сумеснай дзейнасці, з'яўляецца адным з эфектыўных сродкаў увядзення беларускамоўнай лексікі ў гутарковую мову дзяцей.

Для арганізацыі гульнявой дзейнасці ствараецца асяроддзе, максімальна набліжанае да рэчаіснасці, якое будзе спрыяць усебаковаму развіццю дзіцяці, у тым ліку мець беларускамоўную накіраванасць. З гэтай мэтай ладзяцца сюжэтна-ролевыя гульні «Дом», «Сям'я», «Святы», «Дні нараджэння», «У гасцях у бабулі». Значнае месца ў гэтых гульнях займаюць дзеянні з лялькамі, праз якія дзеці перадаюць тое, што ведаюць пра сваіх аднагодкаў, сямейныя адносіны, паводзіны дарослых.

Асноўнае месца займаюць гульні на вытворчыя і грамадскія тэмы, у якіх адлюстроўваецца праца людзей, тэматыка якіх выбіраецца з рачаіснасці па жаданні выхаванцаў. Такія гульні спрыяюць ранняй сацыялізацыі выхаванцаў, маюць практычную накіраванасць, рэалізуюць кампетэнтнасны падыход. Дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту могуць з дапамогай дарослага арганізоўваць гульнявыя комплексы: «Цэнтр бытавых паслуг» (атэлье, пральня, рамонт бытавой тэхнікі, цырульня), «Цэнтр абслугоўвання насельніцтва» (крама, кафэ, салон прыгажосці, медцэнтр, тэатр, клініка для хворых жывел, ветэрынарная аптэка, транспарт і інш.), «Турыстычнае падарожжа» (заапарк, турагенства), «Прамысловасць Беларусі» (фермерская гаспадарка, малочны завод, хлебазавод, будаўніцтва, пельменная фабрыка). Для пашырэння гульнявой дзейнасці вырабляюцца фігуры звяроў, птушак, касцюмы рабочых птушкафабрыкі, доктара, абслугоўваючага персаналу заапарка і пельменнай фабрыкі, формы афіцыянтаў, бортправаднікоў.

З мэтай рэалізацыі прынцыпаў патрыятычнага выхавання шырока выкарыстоўваюцца гульні на героіка-патрыятычныя тэмы, якія выхоўваюць пачуцці гонару і павагі за сваю Радзіму, за свой народ, яго мову, гісторыю, культуру, адлюстроўваюць гераічныя подзвігі землякоў, праз якія дзеці знаёмяцца з традыцыямі і абрадамі беларускага народа, працай людзей, вытворчасцю цацак і беларускай лялькі, ткацкай прамысловасцю і інш. Для рэалізацыі гэтых гульняў выраблена розная атрыбутыка: касцюмы выратавальнікаў, машыны, прылады для іх працы, створана пляцоўка «Служба МНС». Арганізавана творчая гульня «Выратавальнікі», якая  аб'яднала ў сабе цыкл сюжэтна-ролевых гульняў «Аэрапорт», «Служба выратавання» «Пошта», «Кафэ».

Гульні па тэме літаратурных твораў, кіно, тэле- і радыёперадач ствараюцца па змесце мультфільмаў, кінафільмаў, казак, што спрые перайманню дзеянняў герояў, засваенню іх паводзін. Развіццю маўлення спрыяюць і так званыя «рэжысёрскія» гульні, у якіх дзіця павінна гаварыць і выконваць разнастайныя дзеянні лялек. Дзейнічае яно пры гэтым у двух планах — і за ляльку, і за сябе. Для пашырэння зместу гэтых гульняў выкарыстоўваюцца лялечны і пальчыкавы тэатры.

Каб зацікавіць выхаванцаў пэўным беларускім творам, заахвоціць іх да паўтарэння і запамінання беларускіх слоў, педагогі суправаджаюць свае расказы нагляднымі матэрыяламі (малюнкамі, цацкамі, аўтарскімі тэматычнымі слоўнікамі з яркімі ілюстрацыямі). Педагогамі створаны альбом  вуснай народнай творчасці. Дзеці вучацца разумець беларускае слова, узнаўляць пачутае.

З мэтай стварэння неабходнай атмасферы арганізуецца прасторавае асяроддзе як у народным стылі (вышыванкі, вырабы з гліны і дрэва, ільну, ткацтва, посуд), так і праз сучасныя падыходы знаёмства з навакольным светам (выкарыстанне ІТ-тэхналогій, тэлебачання, відэапраграм і г. д.).

Для назапашвання камунікатыўнага вопыту з выхаванцамі вядзецца пастаянная праца: арганізоўваюцца назіранні, прагулкі і экскурсіі па родным мясцінам, дзейнічае міні-музей «Беларуская хатка», працуе куток «Бібліятэка» для разглядання ілюстрацый і знаёмства з беларускай кнігай, адкрыта друкарня «Літарка», дзе выхаванцы маюць магчымасць стварыць кнігу самастойна.

Чытанне мастацкіх твораў, паказ відэафільмаў, разглядванне малюнкаў і рэпрадукцый карцін — гэта набыццё выхаванцамі новых уражанняў, як вынік, з'яўляецца новы змест гульнявой дзейнасці. Так, пасля знаёмства з прамысловасцю Беларусі ў дзяцей узнікла ідэя гульні «Пельменная фабрыка». Для арганізацыі ў гульні вырабу «прадуктаў харчавання» наяўных ведаў стала недастаткова, узніклі пытанні. Гэта паслужыла штуршком для збору інфармацыі аб працы супрацоўнікаў прамысловасці, былі праведзены заняткі на тэму «Хто працуе на фабрыцы», «Як да нас прыйшлі пельмені», рэалізаваны даследчы праект «Перат-

Рэпазіторый БарДУ

варэнне мукі». У выніку арганізаваны комплекс сюжэтна-ролевых гульняў, аб'яднаных адной тэматыкай, — «Прамысловасць», у які ўвайшлі гульні «Пельменная фабрыка», «Гіпермаркет», «Аўтапарк», «Банк».

З мэтай пашырэння беларускамоўнага лексічнага запасу ў дзяцей педагогамі ствараюцца гульнявыя развіваючыя дапаможнікі: кнігі-шырмы, лэпбукі, льнобукі, інтэрактыўныя гульні. Выхаванцы, дзейнічаючы з імі, маюць магчымасць знаёміцца са з'явамі навакольнага свету і рэчаіснасці, запамінаюць словы роднай мовы і ўжываюць іх у правільным кантэксце, таму што дакладна разумеюць сэнс таго, што гавораць.

Педагагічным калектывам знойдзены дзейсны метад мадэлявання педагагічнага кіраўніцтва гульнёй праз выкарыстанне тэхналагічных карт і алгарытмаў арганізацыі і правядзення сюжэтна-ролевай гульні.

**Заключэнне.** Ствараючы беларускамоўнае камунікатыўнае асяроддзе, мы зрабілі яго інфарматыўна багатым, гульнявым, тэматычным. Галоўная накіраванасць такога асяроддзя — даць магчымасць кожнаму выхаванцу рэалізаваць права выбару дзейнасці, набыцця ўласнага вопыту, фарміравання ўменняў і іх рэалізацыі, забяспечыць змястоўныя зносіны дарослых і дзяцей.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Старжынская, Н. С.* Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашк. адукацыі / Н. С. Старжынская, Дз. М. Дубініна. — Мазыр : Белы Вецер, 2008. — 112 с.
2. *Пралыгіна, Н. В.* Арганізацыя работы па развіццю беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ў розных відах дзейнасці ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі / Н. В. Пралыгіна // Дошкольное образование: опыт, проблемы, перспективы : сб. науч. ст. IX Междунар. науч.-практ. семинара. — Барановичи : Хохол Е. Г., 2018. — С. 81.

УДК 373.24

**Масальская Марина Антоновна**
*Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь, marina.masalskaya.2000@mail.ru*

# ФОРМИРОВАНИЕ ЭКОНОМИЧЕСКИХ ПРЕДСТАВЛЕНИЙ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА В ПРОЕКТНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ КАК ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРОБЛЕМА

Статья посвящена проблеме формирования экономических представлений у детей старшего дошкольного возраста в проектной деятельности. Автор рассматривает значение формирования экономических представлений, сущностные характеристики данного понятия, раскрывает суть проектной деятельности как нового направления в процессе формирования экономических представлений у детей старшего дошкольного возраста, рассматривает различные подходы педагогов к определению проектной деятельности, а также её цель — развитие свободой творческой личности ребёнка. В результате определено, что в проектной деятельности у детей формируются экономические представления и умения, а также умения самостоятельно добывать новые знания, собирать необходимую информацию, выдвигать гипотезы, делать выводы.

**Ключевые слова:** проектная деятельность; экономические представления; дети старшего дошкольного возраста.

**Masalskaya Marina Antonovna**
*Grodno Yanka Kupala State University, Grodno, Belarus, marina.masalskaya.2000@mail.ru*

# FORMATION OF ECONOMIC IDEAS IN OLDER PRESCHOOL CHILDREN IN PROJECT ACTIVITIES AS A PSYCHOLOGICAL AND PEDAGOGICAL PROBLEM

The article is devoted to the problem of formation of economic ideas of children in older preschool age in project activities. The author studies the significance of the formation of economic ideas, the essential characteristics of this concept, discloses the essence of project activity as a new direction in the process of forming economic ideas of older preschool children, studies various approaches of teachers to the definition of project activity, as well as its goal — the development of the creative personality of the child by freedom. As a result, it was determined that in project activities children develop economic ideas and skills, as well as the ability to independently get new knowledge, find the necessary information, make hypotheses, and draw conclusions.

**Key words:** project activity; economic ideas; older preschool children.

**Введение.** В современных условиях развития общества экономика является не только отраслью деятельности, но и полноценной сферой жизни, что влечёт за собой необходимость в экономическом воспитании детей дошкольного возраста. На первый взгляд понятия «экономика» и «ребёнок дошкольного возраста» могут показаться не взаимосвязанными между собой. Но современный ребёнок уже с са-

© Масальская М. А., 2021



Репозиторий БарГУ